УДК 93/94(930)

# Вусная гісторыя як метад гістарычнага даследавання

Кедрык Т.В.
Беларускі нацыянальны тэхнічны ўніверсытэт

Вусная гісторыя – даволі маладая навуковая дысцыпліна, якая сфармавалася ў сярэдзіне XX ст., аднак як вытокі сягаюць у далёкае мінулае. У вызначэнні статуса вуснай гісторыі існуе шмат дыскусійных момантаў: вызначэнне прадмета вывучэння, праблема самастойнасці вуснай гісторыі як навуковай дысцыпліны: яна можа ўспрымацца як вусная інфармацыя ў розных формах – ад чутак і ўспамінаў да былін, або як навацыйны накірунак гістарычных даследаванняў. Сярод комплекса прычын, умоў і фактараў станаўлення вуснай гісторыі як самастойнай галіны гістарычнага даследавання ў другой палове XX ст. варта вылучыць тры. Па-першае, з'яўленне і ўдасканаленне тэхналогій запісу і захоўвання аўдыё-і візуальнай інфармацыі, якія зрабілі фіксацыю вусных сведчанняў надзейнай і даступнай для шырокага кола даследчыкаў і знялі праблему недаверу да даследчыка, які раней фіксаваў вусную інфармацыю ўручную.

Па-другое, крызіс традыцыйнай пазітывісцкай гісторыі і так званыя міждысцыплінарныя павароты другой паловы XX ст. (лінгвістычны, сацыялагічны, антрапалагічны і інш.) прывялі да перагляду прадмета, метадаў, прынцыпаў, тэорый, метадалогій і крыніц гістарычных даследаванняў. У поле зроку акадэмічнай навукі патрапілі элементы мінулага жыцця, якія раней ігнараваліся – лад жыцця людзей, іх паводзіны, ментальнасць, ідэнтычнасць, этнічнасць, жыццёвыя ўстаноўкі, ацэнкі імі падзей, чуткі, штодзённасць і інш. Пашырэнне і ўскладненне даследчага поля прывяло да ўзмацнення міждысцыплінарных сувязяў гісторыі з іншымі сацыяльнымі і гуманітарнымі навукамі. Вусная гісторыя абавязана сваім узнікненнем ўзаемадзеянню гісторыі перш за ўсё з сацыялогіяй, лінгвістыкай, культурнай антрапалогіяй.

Па-трэцяе, сярод фактараў фарміравання вуснай гісторыі варта зазначыць комплекс праблем, звязаных са станам базы крыніц гістарычных даследаванняў. Фонды дзяржаўных архівасховішчаў, якія фармаваліся цягам некалькіх стагоддзяў, апынуліся не гатовыя да новых запытаў гісторыкаў – яны былі ўкамплектаваны пераважна афіцыйнымі дакументамі, статыстычнай інфармацыяй па функцыянаваньню дзяржавы, вялікіх сацыяльных груп, эканамічнаму развіццю і г.д. У іх адсутнічаў «чалавечы матэрыял», неабходны для паўнавартаснай рэканструкцыі гістарычнага жыцця. І вусная гісторыя змагла даць матэрыял для даследавання тых «гістарычных лакун», якія ўтварыліся ў сілу недахопу ці закрытасці архіўных матэрыялаў, якія датычыліся гісторыі XX стагоддзя.